## Пытанні да віраванкі

| № | Цікавыя факты | Народныя назвы | Паходжанне слова | Расліна ў культуры, грамадстве, прыродзе |
|---|---|---|---|---|
| 1 | Агародная расліна з моцным пахам, якая ў сушаным выглядзе ў 2–3 разы больш энергетычная за свежую.<br>У Старажытнай Грэцыі і Старажытным Рыме пышны букет гэтай расліны быў звычайным падарункам для дамы | Цімон, копіор | Ад грэчаскага “духмяны” | <br>Мастак К.Аланэ |
| 2 | Адзін бок гэтай лекавай расліны, падобнай да дзьмухаўца, халодны, а другі – цёплы.<br>Гэта жывы барометр, бо загадзя згортвае пялёсткі перад дажджом | Маташнік, маць-мачыха, камчужная трава | Ад стараславянскага “белы” | <br>Мастак А.Піхтоўнікаў |
| 3 | Расліна, з якой вырабляюць еўра і называюць беларускае золата. Летам адзенне з яго стварае адчуванне прахалоды і адводзіць лішак цяпла ад скуры, а зімой саграе. Раны пад павязкамі з гэтай расліны гояцца хутчэй | Даўгунец, сырэц | Ад лацінскага “палатно” | <br>Расліна адлюстравана Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь |
| 4 | Маленькая лугавая кветачка блакітнага колеру. Паводле легенды, багіня Флора дала імёны ўсім кветкам, акрамя адной. Калі яна сказала: “Не забудзь мяне”, багіня адказала, што гэта і будзе яе імя.<br>Сімвал генацыду армян | Прыгожніца | Ад лацінскага “мышынае вушка” | <br>Мастак А.Зражэўскі |
| 5 | Некаторыя віды гэтага меданоса здольны лячыць шаленства ў сабак. У народнай медыцыне прымяняецца як сродак ад вяснушак | Бурачок, каменнік | Ад грэчаскага “сабачае шаленства” | <br>Фотаздымак расліны |
| 6 | Каштоўная лекавая расліна з моцным эфірным пахам, якую Ной даў голубу, каб праверыць, ці скончыўся патоп | | Ад грэчаскага “бальзам”, “вадкі пах” | <br>Мастак А.Кіпрэнскі |
| 7 | Прыдарожная, палявая расліна, выдатны сродак пры загойванні ран | Бабка, парэзнік | Ад нямецкага “дарога” і “расліна” | Успамінаецца ў творы Уільяма Шэкспіра “Рамэо і Джульета”, каб спыніць кроў на калене |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 8 | Адзін з самых старажытных злакаў. У адным пачатку гэтай расліны да 1000 зярняткаў, іх колькасць заўсёды цотная | Маіс | З іспанскай мовы азначае “папяровы пачак” |  М.Хрушчоў з раслінай |
| 9 | Гэта лекавая балотная расліна выкарыстоўвалася беларусамі замест мыла і пральнага парашку | Татарскае зелле, салодкі сцяг | Ад грэчаскага “траснік” | Вобраз расліны ўжыты ў вершы Рыгора Барадуліна “Трэба дома бываць часцей” |
| 10 | Лекавая расліна, сімвал любові і вернасці. Размнажаецца толькі насеннем, з’яўляецца пустазеллем. У Старажытным Егіпце асацыіравалася з богам Сонца Ра | Нівянік | Ад лацінскага слова “рымская” |  А.Карабельнікаў |
| 11 | Куст з карыснымі ягадамі чырвонага колеру з гаркаватым смакам, які прападае пасля замаразкаў. Сімвал дзявочай прыгажосці | Калёная | Ад лацінскага “ўпрыгожваць” | Назва расліны ўжываецца ў фразеалагізме: … мост – казачны мост праз раку, які аб’ядноўвае свет жывых і мёртвых. Ужываецца ў назве кнігі беларускай паэткі Яўгеніі Янішчыц “… зімы” |
| 12 | Злакавая расліна, якая выкарыстоўваецца ў ежу і на корм жывёле. Адзін з сямі дароў Дэметры – багіні ўрадлівасці | Аўсюг | Ад старажытнаіндаеўрапейскага “ежа” |  Каша з гэтай расліны |
| 13 | Галоўная алейная сонцалюбівая расліна з насеннем семкамі, якія ўжываюцца ў ежу | – | Ад грэчаскіх слоў “сонца” і “кветка” |  Мастак І.Машкоў |
| 14 | Лекавая расліна, якую ў старажытнасці называлі “лекамі ад 99 хвароб”. Выкарыстоўвалася як фарбавальнік. Зацвітае на Івана Купалу | Заячая кроў, зверабой | Ад слова “кроў” |  Малюнак расліны |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 15 | Каштоўная кармавая культура. У сучасным свеце з’яўляецца сімвалам Ірландыі. На гербе Беларусі сімвалізуе сувязь з жывёльным светам | Кашка, дзяцеліна | Ад нямецкага слова “klewer” |  Расліна адлюстравана Дзяржаўным гербе Рэспублікі Беларусь |
| 16 | Дэкаратыўная, харчовая (з насення робяць крупы і муку), лекавая расліна. У Японіі расліну параўноўваюць з мясам кальмара | Шчырыца | Ад багіні смерці Мары і прыстаўкі а-, што азначае “бессмяротная кветка” |  Фотаздымак расліны |
| 17 | Расліна роду сланечніка, якая не накоплівае ў сабе радыяцыі | Сонечны корань, земляны яблык | Ад італьянскага “сланечнік” |  Малюнак расліны |
| 18 | Алейная расліна, якая ўтварылася шляхам скрыжоўвання капусты і сурэпіцы, выкарыстоўваецца для вырабу алею. Мае важнае эканамічнае значэнне, так як выкарыстоўваецца для атрымання біядызеля | Кольза | Ад нямецкіх слоў “рэпа” і “семя” |  Фотаздымак расліны |
| 19 | Балотная расліна, якая выкарыстоўваецца для азелянення берагоў. Нашы продкі выкарыстоўвалі яе для пляцення шнуроў або звязвання чаго-небудзь | Балотніца | Ад праславянскага “сетка” |  Фотаздымак расліны |
| 20 | Старажытная стручковая расліна, якая выкарыстоўваецца на корм жывёлам і на ежу людзьмі. Бацвінне ўтрымлівае вялікую колькасць азоту | Пелюшка | Ад грэчаскага “церці” |  Расліна на палатне Э.Пойнтэра |
| 21 | Шматгадовая травяністая расліна з вялікімі падземнымі каранямі, дзякуючы якім яна здольна перажыць пажар. Калі каровы харчуюцца гэтай раслінай, то даюць больш малака | Елачка, свінячнік | Назва паходзіць з еўрапейскіх моў і перакладаецца “конскі хвост” |  Фотаздымак расліны |

| | | | | |
|---|---|---|---|---|
| 22 | Лекавая расліна з жоўтымі кветкамі і ярка-аранжавым сокам, якая расце каля плота, уздоўж дарог. Паводле павер'я, зацвітае, калі прылятаюць ластаўкі, а пладаносіць, калі яны адлятаюць у вырай | Барадавачнік | Ад лацінскіх слоў "дар нябёс" | <br>Фотаздымак расліны |
| 23 | Кветкавая расліна з прыемным пахам, на аснове якога створаны парфюмерныя шэдэўры. Першацвет, імклівае вясновае вынішчэнне якога можа прывесці да пагрозы яго знікнення і пашырэння спісу раслін, уключаных у Чырвоную кнігу Рэспублікі Беларусь | Заячыя вушы | Паводле некалькіх версій, ад слоў "гладыш" або "ладан" | <br>Малюнак расліны на паштоўцы |
| 24 | Калючы куст з невялікімі кветкамі з вялікай колькасцю вітаміну С.<br>Плады выкарыстоўваюцца для вырабу мармеладу, цукерак, кісялю | Дзікая ружа | Ад слова "шып" | О Беларусь, мая …, зялёны ліст, чырвоны цвет!<br>У ветры дзікім не загінеш, чарнобылем не зарасцеш.<br>Уладзімір Дубоўка |
| 25 | Лекавая расліна, якая вырошчваецца ў пакоях, аранжарэях. Цвіце раз у сто год | Сталетнік | Ад арабскіх слоў "горкае рэчыва" | <br>Фотаздымак расліны |
| 26 | Лекавая расліна, якая ўтрымлівае ў сабе эфірнае масла і выкарыстоўваецца ад прастуды і грыпу | Дзіўнае дрэва | Ад французскага "добра пакрытае дрэва" | <br>Фотаздымак расліны |
| 27 | Вечназялёнае дрэва, якое адрозніваецца высокай марозаўстойлівасцю. Выкарыстоўваецца як для вырабу венікаў, так і для мастацкай стрыжкі | Жыццёвае дрэва | Ад старажытна-грэчаскага кораня, які азначае "ахвяраванне" | <br>Фотаздымак расліны |